Будучыня
залежыць ад клімату–
клімат залежыць
ад цябе

Future
depends on the climate –
climate depends
on you

Паштоўкі падрыхтаваны і выдадзены ў рамках праекта
«Узаемасувязь паміж праблемамі
навакольнага асяроддзя і бяспекі ў Беларусі».

Postcards are developed and published
in the framework of the Project
"Linking Environment and Security in Belarus".

ЭКО ПАРТНЕРСТВО

REC

ENVSEC

UNDP

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
МУЗЕЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ
www.etna.by

Belarusian State Museum
of Folk Architecture and Rural Lifestyle



Змяненне клімату сёння стала заўважным па ўсёй планеце. Беларусь не стала выключэннем. Апошнія дзесяцігоддзі сярэдняя гадавая тэмпература па краіне ўзрастае, зіма становіцца больш цёплай, а лета больш спякотным і засушлівым. Часцей сталі назірацца катаклізмы надвор'я: моцныя дажджы, снегапады, пажаранебяспечнае становішча.

Будучыня залежыць ад клімату — клімат залежыць ад цябе

На глабальны працэс змянення клімату ўплывае шмат фактараў, аднак павелічэнне выкідаў парніковых газаў у выніку чалавечай дзейнасці сёння не выклікае сумненняў. Наступствы і шкода ад змянення клімату патрабуюць тэрміновых і радыкальных мер. Значныя намаганні робяцца на міжнародным узроўні. Аднак, гэтага не дастаткова — кожны чалавек павінен зрабіць свой унёсак у глабальную справу.

Нашы штодзённыя звычкі ўплываюць на колькасць выкідаў парніковых газаў. Карыстаешся ты ўласным аўтамабілем або ездзіш на ровары, набываеш шмат рэчаў або ашчадна ставішся да ўжо набытых, карыстаешся энергаэфектыўнай тэхнікай або не звяртаеш на гэта ўвагі — кожны твой выбар важны.

Калі азірнуцца на страдаўні быт беларусаў, паглядзець, як яны гатавалі ежу, выраблялі адзенне, будавалі жыллё, ва ўсім можна ўбачыць цесную сувязь з прыродай. Шмат з прадметаў, якімі яны карысталіся, нам невядомыя, але варта памятаць свае карані. Кажучы сучаснымі словамі, старадаўні быт быў нашмат больш экалагічны, чым сучасны.

Спадзяемся, нашыя паштоўкі дапамогуць вам даведацца пра цікавыя факты з гісторыі беларускага быту і знайсці лепшыя экалагічныя рашэнні для сучаснага жыцця.

---

Climate change has now become noticeable and relevant around the globe. Belarus is not an exception. During the last few decades, the average annual temperature in the country has increased, winter has become warmer, and summers warmer and drier. Weather disasters such as heavy rains and snowfalls, fire-risk situations are observed more often.

Future depends on the climate – climate depends on you

Many factors influence the global process of climate change; however, the increase in greenhouse gas emission because of anthropogenic activity is undoubtedly taking place. Consequences and damage from climate change requires urgent and drastic measures. Significant efforts are being made at the international level. However, it is not enough — everyone must contribute to this global deal.

Our daily habits affect the amount of greenhouse gas emissions. Whether you drive your own car or ride a bicycle, buy many new things or take care of the already acquired ones, use energy efficient devices or do not pay attention to it — every choice you make is important.

If you look back on the old lifestyle of Belarusians and see how they used to cook food, make clothes, and build houses — you can see a close connection with nature everywhere. Many of the things they were using are unknown to us, but it is vital to know one's roots. In modern parlance, the old way of life was much more environmentally friendly than the current one.

We hope our postcards will help you learn interesting facts about the history of Belarusian life and find the best environmentally friendly solutions for the modern life.






Будучыня залежыць ад клімату— клімат залежыць ад цябе

## ПРАС.

Змяненне клімату – новы выклік для чалавецтва. Каб спыніць рост тэмпературы на планеце, неабходна зменшыць выкіды парніковых газаў.

Напрыклад, раней прас працаваў не ад электрасеткі, а на вуглях. Гэта значыць, ён спажываў энергію ад узнаўляльнай крыніцы – драўніны. Сёння прасы і іншыя электрапрылады спажываюць скарыстоўваюць шмат энергіі з неўзнаўляльных крыніц.

**Каб менш уплываць на клімат, ты можаш набываць энергаэфектыўную тэхніку. Інфармацыю пра клас энергаэфектыўнасці можна знайсці на ўпакоўцы або налепках. Трэба выбіраць тавары класа A+, A++.**

Future depends on the climate climate depends on you

## PRAS (IRON).

Climate change is a new challenge for humankind. To stop the increase of the planet's temperature, it is vital to decrease greenhouse gas emissions.

For example, the iron previously worked from heating on charcoal and was running off a non-renewable energy source. Today irons and other electrical appliances use much more energy from renewable sources.

**In order to affect the climate less dramatically, you can use energy efficient technologies. Information about the class of energy efficiency can be found on packaging or labels. It is necessary to choose the products with the class A +, A ++.**


ЭКОПАРТНЕРСТВО REC ENVSEC UNDP

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ
www.etna.by

Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle






**МАСЛАБОЙКА –**
**прылада для вырабу масла.**

Рост аб'ёмаў вытворчасці прадуктаў харчавання патрабуе вырубкі лясоў, узворвання новых земляў, росту пагалоўя жывёлы – усё гэта вядзе да павелічэння выкідаў парніковых газаў.

У даўніну ежа на стале чалавека з'яўлялася дзякуючы ўласнай гаспадарцы. Людзі вырошчвалі гародніны і гадавалі жывёлы столькі, колькі ім было неабходна для існавання.

**Зменшыць свой негатыўны ўплыў на клімат можна, калі набываць мясцовыя і сезонныя прадукты, а таксама фермерскія альбо арганічныя прадукты. Пры іх вырошчванні не ўжываюцца ненатуральныя ўгнаенні або пестыцыды.**

**MASLABOJKA (Butter mill) – a tool for making butter.**

Growth in food production requires deforestation, ploughing of new lands, growth of animal livestock – all that results in increased greenhouse gas emissions.

In the past, a family would provide food for themselves by farming. They grew vegetables and kept animals as was necessary to fulfil their demand. Those products did not contain harmful substances.

**You can decrease the negative influence on the climate by buying local and seasonal products as well as farm or organic ones, since farmers do not use unnatural fertilizers or pesticides while growing such products.**

ЭКОПАРТНЕРСТВО
REC
ENVSEC
UNDP
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
МУЗЕЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ
www.etna.by
Belarusian State Museum
of Folk Architecture and Rural Lifestyle






## БЕЛАРУСКАЯ ХАТА XIX СТ..

Сучасныя дамы вельмі адрозніваюцца ад тых хат, дзе жылі нашыя продкі. Шматпавярховыя гмахі сталі вельмі камфортнымі, іх будуецца вялікае мноства. Будаўнічая галіна штогод правакуе выкід вялікай колькасці парніковых газаў у атмасферу.

**Зменшыць свой уплыў на клімат можна, калі выбіраць для пражывання энергаэфектыўныя дамы, альбо павялічыць энергаэффектыўнасць старога жылля. Ставіць энергазберагальныя вокны і дзверы, карыстацца святлодыёднымі лямпачкамі і энергаэффектыўнай тэхнікай. Таксама лепш аддаваць перавагу будаўнічым матэрыялам з экалагічнай маркіроўкай.**

## BELARUSIAN CHATA (HOUSE) IN THE 19th CENTURY.

Modern houses dramatically differ from those houses in which our ancestors lived. Multi-story buildings have become very comfortable and are being built quickly in large quantities. However, the construction industry emits a large amount of greenhouse gases.

**You can reduce your impact on the climate by choosing energy efficient houses for living or by increasing the energy efficiency of an old house. You can install energy-efficient windows and doors, use LED light bulbs and energy efficient appliances. It is also better to purchase construction materials with ecological labelling.**

---

ЭКО ПАРТНЕРСТВО REC ENVSEC UNDP

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ
www.etna.by

Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle






**ЧАСАЛА –**
**прылада для вырабу тканіны.**

Сёння чалавецтва выкарыстоўвае шмат рэчаў. Праз кароткі прамежак часу гэтыя тавары становяцца смеццем. Палігоны для адыходаў растуць вакол усіх населеных пунктаў вельмі хутка, атручваючы ваду, паветра, зямлю і выпускаючы парніковыя газы.

Раней людзі выраблялі вопратку, абутак, мэблю сваімі рукамі,выдаткоўвалі на гэта шмат часу і ашчаджалі рэсурсы. Уласна выраблецымі рэчамі яны карысталіся доўга, перадавалі іх нашчадкам.

**Ты можаш змяніць сваё стаўленне да шопінгу: аддаваць перавагу якасным таварам, якія праслужаць табе доўгі час, а непатрэбныя рэчы аддаваць іншым.**

**ČASALA (BRUSH FOR YARN) –a tissue manufacturing tool.**

Nowadays people buy many different things, which turn into waste after a while. The landfills for solid municipal waste are growing relatively quickly around living areas – they are poisoning water, air and land as well as are emitting greenhouse gases.

Before, people were making clothes, shoes, furniture with their own hands; they were spending considerable time, and were saving resources. They were using their hand-made products for a long time and were passing them to descendants.

**You can change your attitude towards shopping: buy quality products, which will serve you longer.**

ЭКО ПАРТНЕРСТВО REC ENVSEC UNDP

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ www.etna.by | Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle






## ДРАЎЛЯНЫ РОВАР.

Сучасны свет нельга ўявіць без транспарту, аднак яго выкарыстанне аказвае значны ўплыў на клімат. Спажыванне паліва і будаўніцтва дарог – адна з крыніц сусьветных выкідаў парніковых газаў.

**У параўнанні з уласным аўтамабілем больш экалагічнымі сродкамі транспарту з'яўляюцца цягнікі – для вялікіх адлегласцяў, гарадскі грамадскі транспарт – для малых. Самым экалагічным сродкам перамяшчэння можна лічыць ровар.**

Дзесяцігоддзі таму беларусы карысталіся нават драўлянымі роварамі. **Сучасныя ровары, яшчэ больш зручныя, што дапаможа табе выбраць двухколавага сябра па душы і карыстацца ім кожны дзень.**

## ROVAR (BICYCLE).

It is impossible to imagine the modern world without transport, the use of which is significantly affecting the climate. Fuel consumption and road construction considerably contribute to the greenhouse gas emission.

**In comparison with a personal car, a train is a more environmentally friendly vehicle for long distances, while urban public transport is preferable for short distances. Bicycle is the most environmentally friendly vehicle.**

Years ago Belarusians were using wooden bicycles. **However, modern two-wheeled friends are more various and convenient for daily use.**

---

ЭКО ПАРТНЕРСТВО
REC
ENVSEC
UNDP

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ
www.etna.by

Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle